...ародная хар...аграфічная драма

Перадновым годам мы зноў сустраліся з даўнонаёмымі любімымі героямі балету В. Заларова «Князь-возера» (аўтар лібрэта Міс Клімковіч). Сустрэча была доўгачаканай, шчырай, святочнай.

Тое, то падзеі твора аддалены ад нас стагоддзямі, не зменшыла сілу іх эмацыянальнага ўздзеяння на розум і сэрцы гледача. І разумела чаму. Тэатр (балетмайстар К. Кулер, мастак С. Нікалаеў, дырыжор І. Драміс) са шчырым хваляваннем расказваў аб лірычных пачуццях, драматычных перажываннях Надзейкі і Васіля, упоравшчасця якіх стаў люты князь з чорнай раяй сваіх паслугачоў.

Са сцэны опернага тэатра, у паэтычным і вобразным танцы спектакль апавядае пра юнацкія радасці і душэўныя трывогі, пра трапны лёс простых працавітых людзей у часы сівой мінуўшчыны.

Аднак тэта зусім не сумная гісторыя жыцця людзей, пакорлівых лёсу, а праўдзівае апавяданне аб мужных і валявых сэрцах, кія трывала абаранялі сваё права на шчасце. Нават у найбольш суровыя перыяды гісторыі яны не трацілі надзеі на вызвалення ад сацыяльнага і нацыянальнага прыгнёту, цвёрдай веры ў перамогу сялянскай праўды над панскай крыўдай, у перамогу людзей высокай маральнай годнасці над жорсткімі цемрашаламі. І змагалася простыя людзі за сваю праўду тымі спосабамі, на якія былі ў той час здатныя.

Спектакль радуе вока, слых, цепыць сэрца, выклікае добрыя, светлыя пачуцці. Аднак высакародныя ідэі яго належаць не толькі гісторыі. Яны выклікаюць роздум аб велічасці нашых дзён, калі, вызваленыя ад жахаў мінулага, савецкія людзі карыстаюцца ўсімі здабыткамі сацыялістычнай працы і культуры і дасягнулі здзяйснення тых мараў, у імя якіх народ калісьці перанёс страшэнныя пакуты і нястачы.

Сапраўдны мастацкі твор заўсёды характэрны надзённасцю сваіх думак, адзінствам зместу і формы, добрым густам і значнай творчай культурай.

У харэаграфічнай драме «Князь-возера» гэтыя рысы пры ўзнаўленні не толькі не згубіліся, але яшчэ больш паглыблены.

Спектакль грунтуецца на музыцы самабытнай па сваёй нацыянальнай інтанацыйнай меладычнай аснове, характэрнай і плённымі творчымі ўплывамі рускай класікі (Рымскі-Корсакаў, Глазуноў). Яна выдатна аркестравана, асабліва ў сімфанічных эпізодах.

Чулым інтэрпрэтатарам балету праявіў сябе малады таленавіты дырыжор І. Абраміс. З ім лёгка адчуваюць сябе і танцоры.

Цудоўныя па сваёй паэтычнасці, гармоніі фарбаў і нацыянальнаму каларыту дэкарацыі і касцюмы С. Нікалаева. Гэта мастак, які глыбока разумее музычную драматургію, тонка адчувае ўсё яе чароўнае хараство. Ён з выключнай чуласцю ўвасабляе думкі і эмоцыі твора ў зрокавых вобразах. І таму можна весці размову не толькі аб партытуры кампазітара, але і пра «партытуру» дэкаратара, якая надзіва сугучна зместу і стылю музыкі. У балеце арганічна спалучаюцца казачныя і рэальныя вобразы. Гэты сінтэз ёсць і ў зрокавым вобразе спектакля. Багацце народнага ўяўлення аб фантастычных сілах прыроды знайшло такое ж яркае ўвасабленне і ў дэкарацыях мастака.

С. Нікалаеў выдатна адчувае жывапісную і танцавальную гармонію. У яго на сцэне заўсёды багата «паветра», шырокая прастора для здзяйснення самых смелых замыслаў балетмайстра. Без трапна знойдзенай мастаком гамы фарбаў нават вельмі вынаходлівыя кампазіцыі харэографа страцілі б сваю самабытную прыгажосць.

Пейзажы С. Нікалаева жывуць на сцэне шчодрым багаццем фарбаў, якія ўласцівы легендзе і ўзніклі ў народным уяўленні.

На здымку: сцэна з балету «Князь-возера». Фота Ул. Крука.

Эстэтычная асаблівасць гэтага пейзажу — тое, што ён вельмі рэалістычны, родны, блізкі нам. Ён паэтычна абагулены, падначалены жанру твора і задуме яго пастаноўшчыка. І не дзіўна, што разам з музыкай глядач асабліва захапляецца гармоніяй фарбаў і вобразаў, якія створаны чулым уяўленнем С. Нікалаева.

Добрым густам і прафесіяналізмам характэрна вырашэнне К. Мулерам асноўных партый і харэаграфічных кампазіцый (карагод, «Юрачка», «Крыжачок», полька). Але празмерна шчодры балетмайстар у русалчыных сцэнах, якія трохі расцягнуты. З гэтай прычыны яны павялічваюць дывертысментнасць спектакля і, паўным чынам, змяншаюць яго сюжэтную выразнасць, кампазіцыйную стройнасць. Надта «балетным» выглядае і фінал карціны, у якой Васіль вядзе моладзь на паўстанне супраць прыгнятальнікаў. Цікавы па задуме, ён не знайшоў пераканальнага сцэнічнага вырашэння.

Кожная творчая сустрэча з маладой балерынай Л. Ражанавай, асабліва ў апошнія гады, паглыбляе нашы ўяўленні аб багатых магчымасцях харэаграфічнага вобраза. І на гэты раз артыстка знаходзіцца ў цэнтры спектакля не толькі таму, што яна выступае ў галоўнай ролі, але дзякуючы дасканаламу майстэрству стварэння псіхалагічнага партрэта на сцэне.

Пасля спектакля нам давялося ехаць дадому з заўзятым тэатралам, чалавекам з тонкім густам. І ўсю дарогу ён доказна і пераканальна сцвярджаў думку аб наяўнасці «ўланаўскай інтанацыі» ў творчым почырку беларускай балерыны. З гэтай думкай нельга не пагадзіцца.

У чым праяўляецца гэтая інтанацыя і паўнае падабенства стылю танца Л. Ражанавай з уланаўскім стылем?

Л. Ражанава, карыстаючыся трапным вызначэннем К. С. Станіслаўскага, жыве на сцэне «жыццём чалавечага духу». Яна паводзіць сябе вонкава вельмі сціпла, ёй не ўласцівы рэзкія, крыклівыя рухі і позы. Пры дасканалым валоданні танцам ва ўсёй яго зграбнасці і эмацыянальнай выразнасці, балерына заўсёды канцэнтруе ўвагу на лірычных пачуццях і драматычных перажываннях гераіні. Артыстка, хоць і дзейнічае на сцэне «без слоў», аднак яе думкі выразна чытаюцца, як у змястоўнай кнізе.

Вось таму такі багаты ўнутраны свет Надзейкі — Л. Ражанавай, так чула ўспрымаем мы ўсе нягоды яе жыцця, радасці і няўдачы, трагедыю маладой жанчыны. Разам з героямі мы верым у галоўную ідэю вобраза: чалавек створаны для лепшай долі, чым ён мае ў грамадстве, дзе пануе хлуслівая воўчая мараль. Надзейка Л. Ражанавай — не гераіня наогул, а беларуская дзяўчына з уласцівымі ёй асаблівасцямі натуры, светаадчування і паэтычным абліччам.

Такая ж шчырасць манеры — характэрная рыса і танца Н. Шэхава (Васіль). Але малады артыст яшчэ не валодае дасканалай творчай культурай. У вобразе яшчэ не прыкметны індывідуальны почырк Н. Шэхава.

З уласцівым яму майстэрствам выступае С. Дрэчын у вобразе князя — разбэшчанага дзікуна і паганага юрліўца. Для яго годнасць чалавека не мае ніякай цаны. Бязлітасна імкнецца князь брудным дыханнем апаганіць самыя светлыя пачуцці і мары Надзейкі. Сцэны Л. Ражанавай — Надзейкі з агідным ёй князем прасякнуты сапраўдным трагізмам і выклікаюць чулую рэакцыю сярод гледачоў.

Знайшлі належнае месца ў спектаклі выкананыя з добрым густам партыі вядзьмаркі Хмары (артыстка І. Дароніна), Ігната (Н. Гурвіч), Змітрака (С. Дзятко) і Дзеда (А. Іваноў).

У поспехах салістаў значная заслуга К. Мулера.

Цікавая пераднавагодняя прэм'ера балетнага калектыву опернага тэатра павінна выклікаць у беларускіх кампазітараў жаданне парадаваць гледачоў новым нацыянальным харэаграфічным творам.

М. МОДАЛЬ.

Лаўрэаты фестывалю

У самыя апошнія дні 1957 года з Масквы прыйшла радасная вестка аб канчатковым падвядзенні вынікаў другога тура Усесаюзнага фестывалю музычных тэатраў, ансамбляў і хораў. На гэты раз журы вынесла рашэнне па выніках выступленняў на фестывалі аркестраў, харавых і танцавальных калектываў, квартэтаў.

Музычныя калектывы адзначаны сорак адным дыпломам першай ступені і семнаццаццю дыпломамі другой ступені. Дыпломы першай ступені атрымалі тры вядучыя калектывы рэспублікі — сімфанічны аркестр Беларускай дзяржаўнай філармоніі, Акадэмічная капела БССР і аркестр народных інструментаў. Дыпломамі лаўрэатаў фестывалю ўзнагароджаны дырыжоры сімфанічнага аркестра В. Дуброўскі і Б. Афанасьеў, мастацкі кіраўнік капелы народны артыст СССР Р. Шырма, мастацкі кіраўнік народнага аркестра народны артыст БССР І. Жыновіч.

Дзённік мастацтва

Змястоўны канцэрт

З поспехам прайшоў сімфанічны канцэрт, у якім былі выкананы Шостая сімфонія Глазунова, канцэрт для скрыпкі з аркестрам Бетховена (саліст Ігар Бязродны), мініяцюры Лядава «Чароўнае возера» і «Кікімара».

У Шостай сімфоніі Глазунова — яркім нацыянальным творы лірыка-эпічнага складу — глыбока і змястоўна адлюстраваны пачуцці рускага чалавека, вобразы рускай прыроды. У гэтым канцэртным сезоне сімфонія выконваецца ў другі раз. Апошняе яе выкананне больш удалае і цікавае, вызначаецца цэльнасцю задумы. Праўда, другая частка сімфоніі (тэма з варыяцыямі) прагучала слабей, чым астатнія. Аднак агульнае ўражанне ад выканання твора добрае. У гэтым — заслуга калектыву аркестра і дырыжора В. Дуброўскага.

Значна ўзрасло майстэрства аркестра. Зладжана і стройна гучаць струнная група, група драўляных духавых. У фінале Шостай сімфоніі добра гучалі і медныя духавыя, якія, нажаль, не часта радуюць нас чысцінёй выканання і бездакорным ансамблем.

З добрага боку паказаў сябе аркестр і ў выкананні мініяцюр Лядава. У першай з іх — «Чароўнае возера» — цудоўная карціна прадстала перад слухачамі: пяшчотныя адценні фарбаў, своеасаблівы гарманічны фон у пачатку і ў канцы твора перададзены вельмі пераканальна.

Мініяцюра «Кікімара», звязаная з фантастычнымі вобразамі рускіх казак, — твор шматтэмны. Кожнаму вобразу сюжэта адпавядае новы музычна-тэматычны матэрыял. Фантастычнасці вобразаў раскрыта аркестрам па-майстэрску. У гэтым — значная заслуга В. Дуброўскага, уважлівага і чулага інтэрпрэтатара самых разнастайных па стылю твораў. Дырыжор ідзе новым шляхам, не пераказваючы чужых думак. Адчуванне стылю не здраджвае яму.

Ігар Бязродны — музыкант глыбокі і ўдумлівы. Ён проста і выразна раскрывае глыбіню і эмацыянальную напоўненасць бетховенскіх вобразаў у скрыпічным канцэрце. Выдатнае валоданне скрыпічнай тэхнікай, багацце фразіроўкі, тэмбраў гучання, прыгожы гук прадэманстраваў Бязродны ў выступленні, якое ў той жа час вылучалася глыбінёй думкі. Яго трактоўцы канцэрта Бетховена ўласціва імкненне да прастаты, вобразнай выразнасці. Мяккая чароўнасць вобразаў фіналу была данесена да слухача з натхненнем і майстэрствам. Наогул гэтае выкананне было яркім і таленавітым, калі не лічыць некаторай вольнасці ў тэмпах першай часткі.

Т. ДУБКОВА.

Творчыя планы

Першыя прэм'еры

Новы 1958 год тэатры Беларусі сустракаюць новым рэпертуарам. Наш карэспандэнт звярнуўся да некаторых кіраўнікоў творчых калектываў з просьбай расказаць аб бліжэйшых прэм'ерах і пра планы на будучае. Вось што яму паведамілі:

— Перад самым новым годам, — сказаў намеснік дырэктара тэатра імя Янкі Купалы Е. Гальдшварц, — наш калектыў выпусціў новы спектакль «Праз дваццаць год» М. Святлова ў пастаноўцы І. Ждановіч (афармленне А. Грыгар'янца). Цяпер тэатр працуе над п'есай беларускага драматурга А. Макаёнка «Каб людзі не журыліся» (рэжысёр Е. Простаў, мастак Л. Файленбоген).

Новымі работамі папоўніцца і рэпертуар рускага драматычнага тэатра БССР імя Горкага. У студзені на яго сцэне пойдуць: «Цар Патап» А. Капкова (рэжысёр В. Фёдараў) і «Васа Жалязнова» М. Горкага (пастаноўка Н. Бондарава). Спектаклі афармляе А. Грыгар'янц.

Дырэктар Магілёўскага тэатра А. Росікаў паведамляе, што іх калектыў пад самы Новы год паказаў гледачам прэм'еру па п'есе «Выбух» беларускіх аўтараў М. Гарулёва і М. Алтухова (рэжысёр А. Раеўскі, мастак М. Волахаў). Бліжэйшая работа тэатра — маладзёжны спектакль «Дальняя дарога» Арбузава, які ставіць рэжысёр-дыпламант Ленінградскага тэатральнага інстытута віцяблянін А. Пушнякоў.

— Да пачатку зімовых канікулаў школьнікаў... дзенскі тэатр падрыхт... дзіцячы спектакль Таг... Як «Анюціны вочкі» ... жысёр А. Геранбург, ... А. Алымаў) — сказа... дырэктар А... Апроч таго, мы... кажам п'есу «... жонкай» англій... матурга Д. Фл... часніка Шэкспі... ноўка Т. Гл... афармленне А. Мар...

Гомельскі тэатр н... ве пазнаёміць сваіх... чоў з прэм'ерамі «У п... ках радасці» В. Ро... (рэжысёр Н. Ульянаў, ... стак В. Есафава) і «П... Артур» Сцяпанава ... жысёр Л. Окунь, ма... Л. Давыдаў).

П'есай В. Розава «У... шуках радасці» зацікав... ся і іншыя тэатры ... Я. Коласа і імя ... скага комсамола Б... (Брэст) — і паставілі ... прэм'еры. У гутарцы ... рэктар брэсцкага тэ... Л. Ваўчэцкі дадаў:

— У студзені мы ... ма выпускаем новы ... такль па п'есе С. ... ва — «Франтавікі» ... дзі, якіх я бачыў»). ... работа рэжысёра Е. ... рына, мастака А. ...

Аркеструю оперу

Міжулы год я ў асноўным прысвяціў стварэнню оперы «Павел Карчагін» па раману М. Астроўскага «Як гартавалася сталь». Гэты мой твор у клавіры ўжо закончаны.

Але наперадзе — самая, бадай, працаёмкая, карпатлівая і адказная справа, звязаная з аркестроўкай твора. Гэта ў мяне зойме многа часу ў новым годзе. Першая карціна ўжо аркестравана.

Збіраюся таксама напісаць некалькі вакальных твораў для харавых калектываў і салістаў.

П. ПАДКАВЫРАЎ,
заслужаны дзеяч мастацтва БССР.

Часопісы ў 1958 годзе

„Советская Отчизна"

У 1958 г. часопіс «Советская Отчизна» пазнаёміць чытачоў з новымі творамі рускіх пісьменнікаў рэспублікі і новымі перакладамі беларускай прозы і паэзіі.

У першых двух кніжках часопіса мы публікуем аповесць Пятра Валкадаева «Разліў». Яна расказвае пра людзей буйнейшай новабудоўлі нашай краіны — Куйбышаўскай гідраэлектрастанцыі. Аўтар паказвае, як у працоўных буднях фарміруюцца характары людзей, як складваецца, і мяняецца чалавечы лёс. У аповесці прыцягвае ўвагу вобраз маладога рабочага Аляксея — выхадца з Беларусі, работніцы бетоннага завода Груні Радасцінай і інш.

Цікавая аповесць маладой пісьменніцы Ніны Навасёлавай «Следчыя». Цэнтральны вобраз твора — выпускніца юрыдычнага інстытута, малады следчы гарадской пракуратуры Кацярына Смаленцава. Чытач пазнаёміцца з работай маладога следчага, прасочыць за станаўленнем характару Кацярыны Смаленцавай, за яе асабістым і грамадскім жыццём.

Невялікая аповесць Барыса Бур'яна «Ля сіняй бухты» прысвечана апошнім дням жыцця беларускага паэта Максіма Багдановіча ў Крыме.

У часопісе будзе апублікавана аповесць Міхаіла Гарбачова «Афіцэр запасу». У цэнтры твора камуніст-трыццацітысячнік, які па закліку партыі прыйшоў на работу ў калгас.

Многа ўвагі ў этым годзе часопіс удзяляе запіскам бывалых людзей, што будуць публікавацца ў спецыяльным аддзеле «Запіскі, успаміны, дакументы». Ужо ў першых нумарах мы пазнаёмім чытача з успамінамі ўдзельніка абароны Брэсцкай крэпасці, цяпер акцёра Львоўскага тэатра, Сяргея Бабронка.

Вобраз буйнейшага кінорэжысёра сучаснасці Сяргея Эйзенштэйна паўстае з запісак Аляксея Слесарэнкі. Аўтар паказвае Эйзенштэйна ў перыяд работы над кінофільмам «Бежын луг», расказвае, як па-наватарску шукаў Сяргей Эйзенштэйн свой творчы шлях у мастацтве.

І студзеня 1959 г. спаўняецца сорак год з дня ўтварэння Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі. У кожнай кнізе часопіса ў новым годзе будзе аддзел, прысвечаны важнейшым датам жыцця Савецкай Беларусі.

Паэзія будзе прадстаўлена паэмай Пімена Панчанкі «Патрыятычная песня» ў перакладзе Наума Кісліка, вершамі рускіх і беларускіх паэтаў рэспублікі.

Як і ў мінулым годзе, у кожным нумары часопіса будуць пастаянныя аддзелы «Сатыра і гумар» і хроніка «Па Беларусі».

М. ГАРУЛЕЎ,
адказны сакратар часопіса «Советская Отчизна».

Прыцемкам, як толькі ў горадзе запаліліся агні, сталічны Мінск стаў яшчэ больш навагодзім: пад высачэзнай, у чырвоных макаўках тэлевізійнай вышкай далёка наўкола ўспыхнулі рознакаляровыя гірлянды святочнай ілюмінацыі, у кватэрах жыхароў вясёлкавым зззяннем зазіхацелі тысячы навагодніх ёлак... Аднак самай дакладнай адзнакай блізкага свята былі людзі з іх радасным клопатам і тлумам. На блачным базары — выцерабленае ляда, у прадуктовых магазінах — няспынная загрузка паліц і прылаўкаў, на якіх тавары таюць з вокаімгненнай хуткасцю, у прамтаварных — стогалосы воклiч пакупніка: «Падайце мне, калі ласка, вунь тое!..» А тым часам у небе плыве серпок месяца, навыперадкі імчацца чырвонакрылыя спадарожнікі Зямлі, і падаюць, падаюць долу бялюткай чысцінёй сняжынкі...

Сярод жыхароў горада ў гэты адменны вечар можна было заўважыць двух цікавых пешаходаў — адзін белы, як лунь, а поплеч з ім юнак, здароўем Вярнідуб. Хто выпадкам звяртаў на іх увагу або, тым больш, падслухаў размову старога і дзецюка, тыя ў адзін голас сцвярджалі, што гэта падарожнічалі Стары і Новы гады. Сапраўды, гэта было так. 1957-дзядуля перадаваў свайму 1958 нашчадку неабсяжную гаспадарку, знаёміў яго з людзьмі і сваімі добрымі справамі. Адзіныя і ўсюдысныя, яны адначасова пранікалі ва ўсе куточкі горада.

Уражанне ад Мінска ў Старога і Новага гадоў засталося самае прыемнае: хаця ў горадзе з кожным днём становіцца цясней ад новабудоўляў, ён робіцца ўсё больш і больш прасторным шырокімі вуліцамі і плошчамі, новымі трамваямі і белакаменнымі гмахамі дамоў, маладымі скверамі і паркамі, дрэвамі, прывезенымі з далёкіх пушчаў...

Потым паміж Старым і Новым гадамі зайшла размова і пра літаратуру, прычым дзядуля нечым нагадваў сівавалосага Янку Маўра, а Новы год меў выгляд маладога паэта, які ў пошуках тэмы і рыфмы гатоў падскочыць да самых зорак і спустошыць усё неба ў сваю запісную кніжку.

— Дык вось, сынок ты мой, — кажа стары маладому, — перадаю табе беларускую літаратуру ў добрым здароўі і росквіце. Перш-наперш, мой запавет табе, хлопча, адначасова з рускім шануй і беларускае слова...

— Цікава, а што новага, добрага пры тваёй бытнасці паявілася ў беларускай літаратуры? — перапыніў хлопец.

— Вось я і кажу, — працягваў стары, — з першага дня гаспадарання чытай, сынку, беларускія газеты, часопісы і новыя кнігі, тады і будзеш ведаць, што ёсць новага і добрага ў літаратуры. Бойся адно ўпадобіцца таму Івану, які не памятае свайго роду. Урэшце, хопіць навучаць: у цябе на плячах галава, а не гаршчок з паранай бульбай, — сам добра ведаеш, як паводзіць сябе.

Прайшоўшы колькі крокаў, дзядуля казаў далей:

— Вось у гэтым доме на вуліцы Энгельса знаходзіцца статыстычнае Упраўленне Саюза пісьменнікаў...

— Можа, Праўленне Саюза?

— Не, браце, хутчэй статыстычнае Упраўленне, бо асноўны занятак гэтай установы — падлікі, хто і колькі напісаў новых твораў. Бавы разлік літкансультантаў — Алесь Якімовіч, Тарас Хадкевіч, Яўген Васілёнак і Алесь Есакоў сядзяць за арыфмометрамі і — чык-пстрык ручкай апарата — здабываюць лічбы. Потым гэтыя гарачанькія, толькі што з-пад малатка дадзеныя яны подбегам нясуць у прыполе на стол старшыні праўлення Петруся Броўкі. А ён з дапамогай свайго намесніка Івана Шамякіна адразу ж, нібы пацеркі, нанізвае кругленькія лічбы на ніткі прамоў і розных дакладаў...

— Ці не лішне ты буркліві, тата? — заўважыў юнак.

— Можа і так, — пагадзіўся бацька, — бо пад старасць бывае з людзьмі такі грэх... Калі ласка, зразумей мяне правільна: не трэба захапляцца поспехамі. У Саюзе цяпер лепш працуюць з маладымі пісьменнікамі, менш пераліваюць з пустога ў парожняе, больш чуецца творчых размоў... Але хваліць іх яшчэ рана...

— А хто жыве ў гэтым доме, насупраць Саюза? — пацікавіўся хлопец.

— У большасці — пісьменнікі.

— «Вядучыя»?

— Не. Пераважна так званыя «іншыя». Вось я цябе і пазнаёмлю...

— З «вядучымі»?

— Пераважна з «іншымі», давай адкінем у бок усякую субардынацыю.

— Дык гэта, можа, будзе не тактычна?

— Затое практычна: языку спакайней будзе, — настойваў стары. — Не будзем упадабляцца некаторым крытыкам, якія бачаць літаратуру толькі ў асобе «асноўных». Дзесяткі «іншых», добрых і розных, таксама робяць літаратуру...

Стары і Новы зайшлі ў двор дома, дзе жывуць пісьменнікі, прыгледзеліся да асветленых акон шматлікіх кватэр... І вось бачаць, на чацвёртым паверсе адчыніліся дзверы, і на балкон выйшаў высокі, атлетычнага складу смуглявы рыбак. Не спяшаючыся, ён развесіў на балконе невад, а потым у ствол дубальтоўкі ўторкнуў спінінг і давай, проста пад вокнамі, закідваць лёску. Смыгануў раз, другі — пуста на кручку...

— Я ж заўсёды казаў, што, дома седзячы, хіба толькі атопак які вывудзіш, — буркнуў ён і сабраў спінінг. Потым, думаючы аб нечым сваім, глянуў з-пад рукі ў далячынь... — Э-ге, а ў «Забалоцці днее»... «Вачыма друга» прыгледзеўся яшчэ лепш... І ў нашых польскіх сяброў сёння таксама святочныя агні...

Стары год растлумачыў навічку:

— Гэта ж Янка Брыль пасля чарговай паездкі на Нёман і Быстранку прасушвае свой невад. З гэтай снастю ён нядаўна і ў Балтыйскім моры пабываў... Дарэчы, Янка заўсёды прывозіць дамоў рыбку, і не простую, а срэбную, нават залатую...

— Брыль — «вядучы»?

— Вядома... А вунь яшчэ адзін «вядучы»... Бачыш у акне? Гэта Іван Шамякін.

Сапраўды, у кабінеце за сталом сядзеў Іван Пятровіч. Перад ім тэлефон, стос паперы. Піша новы раман... І, заўважце, працуе, апусціўшы ногі ў ванну, у якой і плынь неглыбокая і крыніцы не цякуць. (Ногі ў ваду ён хавае дзеля таго, каб лепш працавалася, — так рабіць параіла яму хатні ўрач Маша, тая самая, што ў «Крыніцах» добра лячыла людзей). Зазваніў тэлефон. Іван зняў трубку і закрычаў прарэзлівым голасам:

— Пасяджэнне? Не магу прыйсці! Маша кажа, што я форы! — паклаў трубку і зноў схіліўся над сталом, боўтаючы нагамі ў гаючай вадзіцы з гомельскага Палесся.

На суседнім балконе паказаўся Іван Мележ у цёплым паліто, павязаны пуховай хусткай (каб не прастудзіцца). Заняўшы звычайную позу, ён чыстасардэчна параіў Новаму году:

— Пасля «Мінскага напрамку», «Пакуль вы маладыя», крочце ў драматургію. У гэтым можаце ўзяць з мяне прыклад. Не пашкадуеце...

На мароз выскачыў у цёплым світары і белых валёнках Макар Паслядовіч.

— Гэта во, — кажа Макар, бегучы ў гараж, — трэба падсасаць машыну, коска, падрыхтаваць яе ў рэйс. Заўтра ж раніцой трэба заглянуць у Пухавічы, гэта во, кропка. Пагляджу, ці ёсць «Святло над Ліпскам», кропка з коскай...

— Бачыш, — тлумачыў Стары год, — чалавек толькі што дыктаваў машыністцы свой новы твор, таму ў яго да языка прыліплі розныя знакі прыпынку...

У суседнім засеку асабістага гаража Макар убачыў Максіма Лужаніна. Той пад каманду шафёра таксама «падсасваў» сваю «Пабеду», усю прыбраную букетамі. Паказваючы на кветкі, Стары год заўважыў:

— Бачыш, колькі ў Максіма прыгажосці? Гарцуе, нібы маладзён! Гэта ж ён другую паэтычную маладосць перажывае. Салаўём заліваецца!

Убачыўшы праз адчыненую фортку аўтааматараў, Тарас Хадкевіч шэптам параіў ім:

— Хлопцы, ага, вы свае машыны пакажыце ў эмтээсе, ага. Я там, калі пісаў раман «Даль палявая», абнаўляючы сваё пісьменніцкае начынне, пазнаёміўся з добрымі, ага, механікамі...

Неўзабаве ў двор пісьменніцкага дома, трымаючы на плячы пераноснае тачыла, зайшоў незнаёмы дзядзька.

— Тачу, вастру!.. Пёры, пілы!.. Нажы, вілы!.. — лемантаваў ён.

На крык выскачыў голаваломы Піліп Пестрак, цягнучы на плячы звычайную аглоблю.

— Холера, — кажа ён, — добра што ты, майстра, сюды паказаўся. Завайстры мне вось гэты аловачак, — і працягвае аглоблю. — Чуеш, «Калі зліваюцца рэкі»... Мне для гэтай рэчы аглобля вельмі патрэбна: ёю можна і як булавой і як пікай дзейнічаць...

Тачыльшчык адмовіўся выканаць просьбу, маўляў, гэта не па яго спецыяльнасці. Тады Піліп не на жарт разлаваўся:

— Пачакай, пачакай! Калі зрушацца рэкі — абавязкова «Сустрэнемся на барыкадах»! Я табе тады пакажу!.. Цяпер не маю часу, бо пішу партызанскую трылогію... — Патрасаючы рукою, ён раптам заўважыў, што на ёй.. пяць пальцаў... Усклікнуў: — І тут, як і ў літаратуры, — абойма!.. Шаманства нейкае!.. — і знік.

Да тачыльшчыка, пацісканючы ў глыбокім роздуме губы, падыйшоў Іван Грамовіч. На шырокай папрузе цераз плячо ён цягнуў перад сабою барабан.

— А ці не можаш ты, браце, пад-

(Заканчэнне на 4-й стар.).



Кнігі, выдадзеныя ...

Ці лёгкі хлеб?

У тым, што ў калгас прыслалі новую загадчыцу бібліятэкі, — не было нічога асаблівага. Але тое, што яна была аднекуль здалёку, — многія ўспрынялі, як насмешку.

— Сваіх у нас хапае, гэтакіх выпускнікоў. Без работы ходзяць, — скардзілася суседкам Мар'я Крышкіна; у яе самой дачка з вясны ні да чаго рук не прыклала. — А гэтая, няма чаго казаць, на лёгкі хлеб з'явілася.

У вёсны сакрэту не ўхаваеш. Валі Баравіковай гэтыя размовы былі вядомы [illegible] на другі дзень яе жыцця ў калгасе. [illegible]тавілася яна да іх спакойна, вонкава [illegible]якава.

[illegible]е, сустраўшыся са старшынёй праў[illegible], расказала яму.

— А ты, [illegible]бі, дачка, — супакоіў яе [illegible]евіч. — Давер не дораць. Яго [illegible]ць.

[illegible]чы яе здзіўленне, дадаў яшчэ: [illegible]сь таксама з гэтага пачынаў. [illegible] тут сабраліся за мяне, а з [illegible]. «Ведаем мы вас. На зарпла[illegible]ыкаў бераце, а карысці, як з [illegible]. Так. Потым наладзілася. Працацяпер не той, што раней быў. [illegible] хлеба па тры кілаграмы на працадзыдалі. У сябе людзі паверылі. А [illegible] выпускнікі, гэтыя, праўда, у два ба[illegible]ядзяць. І ў горадзе добра, і калгас [illegible]даць шкада. Вырашыць лёс іх — цяпер самае галоўнае. І за справу гэтую мы [illegible]бою павінны брацца.

[illegible]алгас «Ленінскі шлях» у Чэрыкаўскім [illegible]не — гаспадарка насенняводчая. Га[illegible]ы ўхіл, аднак, не стрымаў развіцця [illegible]х галін. Тут лепшыя ў раёне фермы [illegible]на-таварнай жывёлы. Добра развітая [illegible]адоўля.

[illegible]зі працуюць старанна, з запалам. [illegible]няўжо радасць чалавечая толькі ў [illegible] каб папрацаваць ды пад'есці? Ра[illegible]удзень працавалі, а ўвечары кожны [illegible]ведаў, за што зачапіць рукі. Добра [illegible]у. Ночы кароткія, адпачыць не па[illegible]. А вось узімку, дык моладзь не ве[illegible]а чаго прытуліцца. Ні песень табе, [illegible]цый у клубе. Цішыня, як у пусты[illegible]ваць жа было каму. І танцорамі [illegible]дней Ахор. Паспрабуй, пашукай у [illegible] салістку, лепшую за Веру Сіўцо[illegible]то лепш мог выбіць гапака на [illegible]чым Рая Хайчанка і Рая Башбала? [illegible] толькі трактарыст Віктар Зайцаў [illegible]паборнічаць з імі. Ды і той забыўся, [illegible]анцаваў апошні раз.

Валі Баравіковай прыйшлося пазнаёміцца з усім гэтым у першыя ж дні. І зразумела яна, што не варта ёй злавацца на Мар'ю Крышкіну. Праўду казала яна. Папярэднія загадчыкі бібліятэкі толькі і займаліся тым, што выдавалі кнігі. На іншую работу не звярталі ўвагі. Свежы прыклад гэтаму — Вера Асінская. Прыходзіла яна ў бібліятэку ці не прыходзіла — ніхто і не заўважаў. Ды і кніжкі чыталі не многія. Магчыма, чалавек сорак з усяго калгаса.

Пачала Валя работу сярод жывёлаводаў. Неяк у бібліятэку зайшла даярка Вольга Кухарэнка. Доўга маўчала, прыглядалася. А калі ў памяшканні нікога не засталося, сказала:

— Пра нашу працу пашукала б якую кніжку. Ды цікавейшую. А?

Валі прыйшлося пачырванець. Як ні шукала — на паліцах ніводнай падыходзячай брашуры. Але паабяцала дастаць.

У ліпені калгас выйшаў на першае месца ў раёне па надою малака. І кожны ведаў, што ў гэтай справе немалая заслуга і Валі Баравіковай, загадчыцы калгаснай бібліятэкі. З таго часу, як у першы раз зайшла да яе Кухарэнка, Валя хадзіла на ферму амаль кожны дзень. Чырвоны куток пачаў працаваць лепш. Не грэцца пачалі ў яго прыходзіць, а прачытаць што-небудзь, паслухаць лекцыю, пагаварыць аб новай кнізе. Чытаць пачалі ўсе. Нават Сцепаніда Гардзейчыкава, якой раней скажы пра кнігі — ад смеху не ўтрымалася б, — цяпер стала прасіць вечарамі:

— Пачытаем, дачушка, а? Дзе мы там спыніліся?

Дачушка чытала. А назаўтра Сцепаніда расказвала даяркам:

— Валя, гэтая самая, у нас — золата. Кніжку дала мне — лепш за ўсякую казку.

Вясной і летам Баравікова ў бібліятэцы не сядзела. Раніцай з дзесяці да дванаццаці, ды ўвечары на гадзіну-другую зойдзе. Больш сярод чытачоў была: на таку, на полі, ля капніцеля разам з іншымі завіхалася. І Валю палюбілі. Яе сталі чакаць. З газетай ці з кніжкай — усё роўна, толькі б яна прыйшла, вясёлая і радасная.

Камсамольцы калгаса выбралі Валю сваім важаком.

Работы, быццам, не прыбавілася, але адказнасць узрасла. Сходы, камсамольскія нядзельнікі, паездкі ў райком, семінары — усё гэта патрабавала асаблівых клопатаў, асаблівай арганізаванасці.

У адзін з вераснёўскіх вечароў у канцылярыю калгаса прыйшла вестка: на дальніх лугах гіне атава. Не ў пару разліўся Сож. Людзі па-рознаму адгукнуліся на гэтую вестку. Адны гаварылі: «Не прападзе». Другія: «Чым намочыць, тым і высушыць». А Валя Баравікова сказала: «Трэба выратаваць!» На бок свайго важака сталі камсамольцы.

Усю ноч, да самай раніцы, чуўся над лугам вясёлы гоман. Не здалася моладзь. Вартавала сена. Тая ж Крышкіна прызнала:

— Працавітая яна, наша Валя.

Так, праўду казаў Павел Якаўлевіч. Давер заслужыць трэба. Тады ён мацнейшы. Валя Баравікова заслужыла яго справамі. Добрае слова, своечасова сказанае, неабходна чалавеку. Умее знаходзіць гэтае слова загадчыца калгаснай бібліятэкі.

Мінуў працоўны дзень. Запаліліся агні ў хатах. З рэпрадуктара кожны раз чуецца:

— У клубе калгаса вялікі канцэрт. Выступаюць удзельнікі калгаснай камсамольскай самадзейнасці.

Людзі спяшаюцца ў клуб. І калі адкрываецца заслона, на сцэну выходзіць Баравікова.

— Слухайце...

І калгаснікі слухаюць «сваіх артыстаў». Жартоўныя частушкі выконваюць Вера Сіўцова і Міша Хайчанка.

Пад вясёлы перабор гармоніка на сцэне ўдала скачуць Рая Хайчанка са сваёй аднагодкай Раяй Башбалай. Ім апладзіруюць доўга. Ёсць у арцелі і свой драмгурток, хоць і маленькі, але калгаснікі ім ганарацца.

Калгасная самадзейнасць толькі зараджаецца. Міне час, і аб удзельніках камсамольскай самадзейнасці будуць ведаць не толькі ў сваім калгасе, але і далёка ў наваколлі. Гэтаму трэба верыць.

Так, многае змянілася ў культуры сяла з таго часу, як у сельгасарцель «Ленінскі шлях» прыйшла новая загадчыца бібліятэкі Валя Баравікова.

Дык хто ж скажа цяпер: «На лёгкі хлеб з'явілася»? Ніхто.

Нялёгкі хлеб у Валі Баравіковай.

А. НІКІФАРАЎ.

Рэпартаж

Весела[illegible] радасна, святочна

Шэры змрок ахутвае заснежаныя паркі і сады і расцякаецца па вуліцах горада. Успыхваюць залатыя маланкі-агні, паралізуюцца, прымушаючы цемру адступіць. Лёгкі марозік пакрывае чырванню твары...

У вячэрні час да Мінскага палаца культуры прафсаюзаў з усіх канцоў горада накіроўваюцца сотні людзей. Адны спяшаюцца наведаць канцэрт, паглядзець спектакль, паслухаць цікавую лекцыю, другія — пакружыцца ў вальсе. Многія, а іх не менш, чым гледачоў і слухачоў — правядуць сёння свой вольны час у разнастайных мастацкіх гуртках.

Цэлая армія моладзі і, трэба сказаць, даволі «агрэсіўная», запаўняе пакоі, залы і нават калідоры. Яна звяртаецца з самымі нечаканымі просьбамі да кіраўніка сектара мастацкай самадзейнасці Мікалая Іванавіча Алімава. У гэты час не знойдзеш ніводнага свабоднага і спакойнага кутка навакол. З блакітнай залы даносяцца чароўныя гукі песні: тут рыхтуе новую праграму народны хор. Больш паўсотні юнакоў і дзяўчат — яго ўдзельнікі. Столькі ж і ў акадэмічным хоры. Усё гэта галасісты народ. Можаце сабе ўявіць, які шум узнікае ў Палацы, калі гэтыя шматлюдныя калектывы збіраюцца разам. А гэта здараецца даволі часта, асабліва ў дні свята або перад канцэртамі. Па ўсіх паверхах велізарнага будынка разносяцца рулады спевакоў. Іх заспакойваюць, просяць:

— Таварышы, цішэй... Вы ж перашкаджаеце нам...

Гэтая просьба ўзнікае тады, калі звонкая песня даносіцца да чацвёртага паверха, дзе адбываюцца заняткі курсаў крою і шыцця. Відаць, песні адцягваюць увагу жанчын ад іх работы.

Затое эстраднаму аркестру ніякі шум не страшны: у руках музыкантаў такія інструменты, якія даюць магчымасць заглушыць любыя гукі. Абмінуць пакой, дзе ідуць рэпетыцыі аркестра, амаль немагчыма. Каля дзвярэй звычайна можна ўбачыць цікаўных хлопцаў, якія слухаюць музыку і зазіраюць у шчыліну: цікава не толькі паслухаць, а і паглядзець, як яны іграюць. А калі аркестранты пачынаюць развучваць кожны сваю партыю, тады іх можна бачыць у любым закутку Палаца, нават на лесвічнай пляцоўцы.

Шумна, весела, радасна, але бывае і цяжка ў калектывах самадзейнасці. І ўсё роўна сюды прыходзяць не толькі дзеля заняткаў, але і каб пазабавіцца і адпачыць пасля работы і вучобы.

Вось рабочы аднаго з мінскіх заводаў Гена Сінько. У мінулым годзе ён быў яшчэ дзесяцікласнікам, а сёння прышыў на рэпетыцыю драматычнага калектыву. Яму давядзецца іграць ролю ў п'есе М. Горкага «Дасцігаеў і другія».

Пасля заняткаў у інстытуце спяшаецца на рэпетыцыі будучы інжынер Наташа Доўнар.

Лёгкія і імклівыя, прабягаюць па дывановых дарожках калідора дзяўчаты ў аднолькавых сукенках. Гэта ўдзельніцы танцавальнага гуртка. Тут жа цяжкай хадой стомленага чалавека ідзе маладая жанчына. У руках яе сетка з нейкімі пакункамі.

— Лілечка, дзень добры!.. Хутчэй! — падганяюць яе дзяўчаты.

— Ат, — з раздражненнем махае яна рукой. — Я страшэнна стамілася. У мяне заўтра ў дзесятых класах урокі па фізіцы і толькі цяпер я здабыла кінофільмы для іх. — І жанчына паказвае на сетку, напоўненую касетамі вузкаплёначных фільмаў. Настаўніца, хоць і стомленая, але дахаты не ідзе.



У зале, дзе цяпер развучваюць новы танец, чуваць гукі баяна. Так утульна, святочна і цікава ў Палацы, што міжволі тут кожны становіцца бадзёрым, і любую стомленасць, як рукой, мае. Праз некалькі мінут мдая настаўніца фізікі грызёна і весела пырхае пзале. І хто, гледячы на, скажа, што ёй ужо неосемнаццаць год, і заўтрна будзе ставіць дзесяцікласнікам у дзённікі адзнакі.

Ці ж можна ралічыць усіх гэтых энтузіястаў мастацкай самадзейнасці назваць іх прозвішчы? Мяз з іх, жыццерадасных і ных, іграюць у аркестрынародных інструментаў, на ымбалах, наведваюць студыкывапісу, секцыю акрабатыкваймаюцца ў гуртку мастацтва чытання.

...Гадзіннік пакідае адзінаццаць. А народны ўмельцы, аматары музык мастацкага слова, танцоры і спевакі толькі яшчэ рыхтуюцца з Палаца па наым ярка асветленым Мінску. Свежыя бадзёрыя, яны зраз зноў знойдуць свае месці каля варштатаў і ў аўдыторыях шматлікіх навучальных устаноў.

Для іх і сённяшняя навагодняя раніца заззяла новым шчасцем і светлымі надзеямі.

На здымках: 1. Практыкаванні па класічнаму танцу. 2. Заняткі над эцюдам у студыі жывапісу.

Тэкст і фота **Ф. Міхайлава.**

[illegible]сь яна, наша таленавітая моладзь, якая бліскуча адстаяла гонар мастацтва рэспублікі на VI Сусветным [illegible]вале ў Маскве! Цудоўнымі беларускімі мелодыямі ў выкананні салісткі С. Гулевіч і жаночага актэту з [illegible]іага хору заслухоўваліся заруб ежныя госці. Яны захапляліся ігрой нашых двух віртуозаў-цымбалістаў [illegible]рковіча і Н. Шмелькіна. Лаўрэацкія медалі, якія ярка гараць на грудзях маладых выканаўцаў, — су[illegible]нае прызнанне не толькі іх творчасці, але і ўсёй самабытнай нацыянальнай культуры беларускага народа.

Замежны гумар

ЗНАЎЦЫ СТАРАЖЫТНАСЦІ

Два вучні, якія ўпершыню трапілі ў Брытанскі музей, разглядалі егіпецкія мумеі. Аднаго з іх здзівіла этыкетка з надпісам, якая ўказвала на ўзрост мумеі.

— Хацеў бы я ведаць, што азначаюць гэтыя лічбы? — спытаўся Чарлі, спыняючыся перад экспанатам з датай — 1.500 да р. х.

— Як, няўжо ты не ведаеш? — здзівіўся другі школьнік. — Гэта нумар аўтамашыны, якая пераехала яе.

АБ КАРЫСЦІ ЛАКАНІЧНАСЦІ

Вядомы амерыканскі гумарыст Марк Твен прыводзіць бліскучы прыклад каштоўнасці кароткай прамовы. Ён расказвае, што аднойчы, калі яму давялося на працягу пяці хвілін слухаць прапаведніка, які абвяшчаў анафему язычнікам, ён зарыдаў і збіраўся ахвяраваць святому манастыру пяцьдзесят долараў; праз дзесяць хвілін пропаведзі ён вырашыў скараціць суму ахвяравання да 25 долараў, праз паўгадзіны ён зрэзаў суму да пяці долараў; а праз гадзіну, калі царкоўны служка абыходзіў веруючых з чашай для збору ахвяраванняў, ён украў два долары.

АДУКАВАНАЯ ПАДАРОЖНІЦА

Вялікі цеплаход, на борце якога знаходзілася партыя турыстаў ЗША, набліжаўся да Афінскага порта. Адна амерыканка звярнулася з пытаннем да памочніка капітана:

— Сэр, вы не скажаце, што ўяўляюць сабой тыя белыя плямы на вяршынях гор?

— Гэта снег, мадам, — адказаў марак.

— Я так і думала, — сказала амерыканка. — Але адзін з пасажыраў толькі што сцвярджаў, што гэта Грэцыя.

ВЫСОКІ ЎЗРОВЕНЬ КУЛЬТУРЫ

Увайшоўшы ў клас, настаўнік заўважыў напісанае на дошцы слова «Гамлет», і, хочучы праверыць веды сваіх вучняў, спытаўся:

— Хто напісаў «Гамлет»?

Жадаючых адказаць не знаходзілася, і гэта вывела настаўніка з раўнавагі. Нарэшце, самы маленькі вучань класа Джоні Сміт падняў руку і сказаў:

— Гэта не я напісаў, сэр!

У гэты час у клас увайшоў галоўны землеўладальнік прыходу.

— Вы толькі паглядзіце на гэтых ёлупняў, — звярнуўся да яго настаўнік. — Я спытаўся ў іх, хто напісаў гэта (ён паказаў на дошку), і Джоні Сміт адказаў: «Гэта не я!»

— У такім выпадку, можаце смела сцвярджаць, што гэта напісаў Джоні, — сказаў землеўладальнік.

Вяртаючыся дахаты пасля заняткаў, настаўнік сустрэў прыхадскога свяшчэнніка і расказаў яму пра ўсё. Той у сваю чаргу здзівіўся.

— Значыць, вы так і не даведаліся, хто напісаў «Гамлет»? — спытаўся ён.

НЕПЕРАБОРЛІВАЯ НЯВЕСТА

Малады чалавек некалькі разоў спрабаваў прызнацца ў каханні, але кожны раз яму не хапала мужнасці. Нарэшце ён вырашыў зрабіць гэта па тэлефоне. Набраўшы патрэбны нумар, ён спытаўся:

— Гэта вы, Мэры?

— Так гэта я, — адказала дзяўчына.

— Мэры, вы хочаце выйсці за мяне замуж неадкладна, зараз?

— Так, хачу, — пачулася ў адказ. — А хто гэта гаворыць?

НЕПІСЬМЕННАСЦЬ ДАПАМАГЛА

Дзяўчына-служанка вырашыла купіць латарэйны білет і папрасіла, каб ёй далі нумар 51. Здарылася так, што гэты нумар выйграў і яна стала ўладальніцай трох тысяч фунтаў стэрлінгаў. Калі да яе звярнуўся рэпарцёр і спытаўся, чаму яна выбрала 51 нумар, дзяўчына адказала:

— Бачыце, сэр, на працягу сямі дзён мне снілася лічба сем, а таму што сем на сем 51, дык я і выбрала гэты нумар.

[illegible]не. Пачатак на 3-й стар.).

[illegible] скуру вось на гэтым му[illegible] інструменце? От, пагадзіся [illegible]ю, не магу без барабана!..

Стары год унёс каментарыі: [illegible]розвішча ў Івана гучнае, як [illegible]. Першыя гады на пісьмен[illegible]ніве добры гром у яго ат[illegible]мўся, а цяпер нешта маў[illegible]. Дык хоча хоць на барабане [illegible]нарабіць — імя здабявзвае.

[illegible]ка непадалёку стары і юны [illegible]нікі ўбачылі на рыштаван[illegible]удоўлі Уладзіміра Карпа[illegible] годам год», цагліну за [illegible]гураваў новы раман. Пры[illegible]ніто будыніна атрымліваец[illegible] добрая, калі не лічыць, [illegible]н нацярухай сям-там асы[illegible]нкоўка. Муляр уздыхае: [illegible]ўмеў рабіць лепшую [illegible] беларускай мовы!.. О, [illegible]ак сцэментаваў бы твор! [illegible] і Новы год пайшлі далей. [illegible] — дзіва дзіўнае! — ся[illegible]ліцы абступілі двух дзядзь[illegible]ёл, Казёл і Касалапы Мішка. [illegible] беручы разгон, кажа сваім [illegible]:

[illegible], пачакайце! От я гэ[illegible]нісцам Уладзіміру Кор[illegible]арду Валасевічу зараз [illegible]блю трапіць на навагод[illegible]дуць ведаць, як безу[illegible]йваць нас у сваіх бай[illegible]

— Я лепш капытамі пачастую іх! — кажа ўпарты Асёл.

Мядзведзь жа, больш разважлівы і спакойны, дакараў байкапісцаў:

— Ну, як вам не сорамна, нашчадкі Эзопа! Каторы ўжо год вы мяне цярэбіце! У свае байкі па шарсцінцы выскублі з мяне ўсю поўсць! Зусім заездзілі! Ног не павалаку...

— Гэта праўда, — пагаджаецца Корбан, — я цябе дужа абскуб. Але што зробіш? Доля твая гэтакая. Цябе і тваіх сяброў Асла і Казла, яшчэ дзядуля Крылоў не вельмі шанаваў. А што, кажаш, заездзілі, дык давай расквітаемся: садзіся на мяне — на гэты раз я цябе падвязу... да бліжэйшай «забягайлаўкі». Там, з выпадку свята зробім міравую, грам, мо, па дзевяцьсот...

— Такую звярыную дозу? — усклікнуў мядзведзь.

— Глупства, — махнуў рукой Корбан, — такая мера для мяне, як для слана шраціна.

Мядзведзь быў стары, знясілены, таму Корбан узваліў яго сабе на плечы і панёс у бліжэйшы «Нёман», каб утапіць звярыную крыўду ў добрым пачастунку Валасевіч жа, паколькі яму пры дапамозе кійка хадзіць нялёгка, сеў вярхом на Асла і паехаў. Асёл ведаў, што ў рэстаране знойдзецца і для яго нейкае пойла. Валасевіч жа таксама здагадваўся, што рэстаран без гарэлкі не бывае, а спажыць гэтага зелля, па сакрэту кажучы, ён трохі можа, — калі не слановую дозу, то за добрае сланяня абавязкова ўправіцца. Казёл плёўся ззаду, — з яго, вядома, — ні шэрсці, ні малака: нічога не п'е, толькі ўмінае вегатарыянскую страву, накшталт вінегрэту.

Убачыўшы на вуліцы звярынец, Павел Кавалёў усклікнуў:

— Якое шчасце! Нядаўна я ездзіў у Клімавіцкі раён, каб напісаць нарыс пра калгас. Дык там на дарозе спаткаўся воўк і «сам папрасіўся» ў твор! А тут аж тры звяры адразу! Гэта вельмі стасуе да калгаснай тэматыкі, бо асёл і казёл — сельскагаспадарчая жывёла. Мядзведзь таксама сельскагаспадарчы аб'ект — цярэбіць пасевы аўсу і выдзірае хатніх пчол.

«Падагуліўшы» сваю думку, Павел адразу ж занатаваў убачанае ў блакнот ведаючы, што гэта спатрэбіцца дзеля нарыса.

Трапіўшы на вуліцу Янкі Купалы, экскурсавод Стары год паказаў Новаму на шматпавярховы, нядаўна заселены дом і сказаў:

— Вось тут таксама жывуць многія пісьменнікі. Вунь, бачыш, Анатоль Вялюгін каля сваёй галубятні на даху прыладжвае неонавую рэкламу: «Спажывайце толькі сітро, лімонад і іншую салодкую вадзіцу. Не рэкамендуем піць гарэ[illegible] «пад коўдрай» і будучы ў камандзіроўцы».

— А што, Вялюгін стаў электрыкам?

— Не, узначальвае таварыства па прапагандзе безалкагольных напіткаў. Пераканаўся, што гэта вельмі зручна для працы і здароўя... У гэтым жа доме, — працягваў Стары год, — жыве і Фаня Алер, якая атрымала тут кватэру за выключныя «творчыя» поспехі... на літфондаўскай ніве. Жыве тут і Алесь Кучар...

— Той самы, што заўсёды качуе: то з крытыкі ў драматургію, то з новай кватэры ў яшчэ навейшую?

— Той самы калабок... А вунь, бачыш, танклявы мужчына цягне ў дом адразу тры круглыя сталы? Гэта Мікола Ракітны. Ён, нарэшце, атрымаў кватэру і цяпер ва ўсіх пакоях абсталёўвае гасціныя. Разумееш, адзін ад радасці шапку ўгару падкідвае, а другі круглыя сталы на плячах цягае, — кожны пасвойму радуецца...

Непадалёку ад «Блакітнага Дуная» спадарожнікі напаткалі маленькага дзядзьку ў ссунутай на вуха шапцы-аблавушцы. Ён стаяў паніклы і горка плакаў, пры гэтым са слёз атрымалася цэлая лужына. Гледзячы на гэты водны басейн, плакальшчык са скрухай у голасе казаў:

— «Вялікі мой і Ціхі акіян»!..

— А гэта хто?

— Паэт Рыгор Няхай.

— Чаго ён так разжаліўся?

— Разумееш, сынку, вельмі цяжка гэтаму чалавеку: кожны месяц на сустрэчах з чытачамі чытае старыя, пятнаццацігадовай даўнасці вершы. Вось і заліваецца слязамі.

Паблізу ад вуліцы Янкі Купалы ў незамярзаючай Свіслачы спадарожнікі ўбачылі вялікую баржу, гружаную бярвеннем розных парод дрэва. Баржу цягнуў саматугам бурлак Раман Сабаленка.

— Адкуль ты, хлапчына? — запытаўся Новы год.

— Ды з Палесся, вядома разумееш, — быў адказ. — Разумееш, дзе [illegible] дзе па вадзе цягну гэтыя чурбакі — загатоўкі на новыя апавяданні, аповесці. Цягну, разумееш, аж з Палесся, з тых часоў, калі яшчэ бегаў у матчыных чаравіках на высокіх абцасах... А вунь тыя абсмаленыя круглякі, разумееш, з франтавых часоў...

— І не цяжка цягнуць такую пасудзіну?

— Якое там! — усклікнуў Раман. — От некалі я вазіў загатоўкі на вершы, дык надта лёгка было... у творчым багажы.

У парку культуры і адпачынку, які знаходзіцца паблізу ад вуліцы Янкі Купалы, Стары і Новы год убачылі за цікавым заняткам крытыка Якава Гярцовіча. Пабудаваўшы папяровы вятрак, ён апусціў крытычнае забрала і з пікай у руках рашуча рынуўся на штурм. Аж латы брадзжэлі. Яго слаўны конь Расінант быў прывязаны непадалёку і з голаду жаваў зборнік літаратурна-крытычных артыкулаў свайго гаспадара.

У гушчары ёлачак парка спадарожнікі сустрэлі і Міколу Ткачова, які вывез у саначках на прагулку сваіх «Пусю і Пуську». Малыя раскрычаліся, тады ён дастаў з кішэні бутэлечку з малаком і пачаў іх падкормліваць з соскі, прыгаворваючы:

— Эх вы, заморышы мае дарагія, Пуся і Пуська! Дзесяты год вас гадую, а вы ніяк не вырасцеце да памераў «Згуртаванасці»!

Стары і Новы год рашылі наведаць некаторых пісьменнікаў на іх кватэрах. Ідучы праз парк, яны ледзь не пакалечыліся, трапіўшы на нейкае драўлянае ламачча. Прыгледзеліся пад ногі, бачаць — валяюцца агрызкі чорных алоўкаў... Пазналі, што гэта зброя некалі належала Алесю Бачылу, у яго бытнасць намеснікам рэдактара адной газеты. Вось гэтымі алоўкамі ён «выпраўляў» артыкулы, якія паступалі ў рэдакцыю. Выкінулі іх, агрызкі, як непатрэбшчыну, і далі Бачылу ў рукі звычайную ручку. Дапамагло! — напісаў добрае лібрэта для оперы.

Андрэя Макаёнка Стары і Новы год заспелі якраз дома. Ён сядзеў на халадзільніку і глытаў вялікімі кавалкамі звычайны лёд.

— «Выбачайце, калі ласка», што з вамі? — пацікавіліся госці.

— І не пытайце! — нерваваўся гаспадар. — У мяне ўсё нутро гарыць! Астуджваюся. Колькі яны мне крыві сапсавалі!..

— Хто?

— Кіношнікі. Напісаў новы сцэнарый. Абмяркоўвалі яго на калегіі... У маім сцэнарыі ёсць адна такая сцэнка: калгаснікі мыюцца ў лазні. Дык адна разумная калегіяльная галава накінулася на мяне, маўляў, чаму я не паказаў там мясцкома. Нібыта без прафсаюзнага кіраўніцтва ніхто не мыецца...

Антон Бялевіч таксама быў дома. Ён сядзеў на зэдліку і, пакрэктваючы, віў доўгія вяроўкі.

— Ці не аборы гэта для лапцяў? — пацікавіліся госці.

— Э-ге, дудкі! — адказаў гаспадар. — Сам я лапці не нашу, а, тым больш, не ўстаўляю іх у свае творы. За гэтую «дзедаўскую тэхніку» мне ў свой час «Звязда» як усыпала, дык яшчэ цяпер чухаюся. Зараз я, калі пішу, напрыклад, пра пастуха, дык не даю яму ў руку пугу — таксама «дзедаўская тэхніка», — а тыцну ў зубы добрую папяросу, «казбечыну», — і ўсё ціха. Нават хваляць, што падаю дакладныя адзнакі часу. А вяроўкі гэтыя — ганарарныя... Ведаеце, нарысы пішу. Вазьму прозвішчы са два, нават без імён, як накручу метраў на дзесяць — маеш нарыс.

Зняўшы з крука гатовую вяроўку, Антон клікнуў жоўку:

— Аня, падсуньі гэты нарыс на шастку каля печы, вады ў ім мнагавата...

— А не вельмі ўсохнецца? — занепакоілася жонка.

— Не бойся. Я звіў яго з запасам, — хопіць і на ўсушку і на аб-

рэзку ў рэдакцыі, застанецца і для мяне добры кавалак.

Новы год пацікавіўся:

— Антон Пятровіч, чуў я, што ты іншы раз на роўнай дарозе спатыкаешся...

— Так, нялёгкі гэта хлеб!.. — Пачакаўшы, Антон зарагатаў: — Але ж ты, малы, пра ўсё ўжо ведаеш! — і дадаў сваё любімае слова: — Сабака ты!..

Сустракаючы пісьменнікаў, Новы год не забываў прывітаць кожнага з іх добрым словам, перадаць шчырае пажаданне працаваць у далейшым яшчэ лепш.

Банадысь АБРОТКА.

Галоўны рэдактар Мікола ТКАЧОЎ.

Рэдакцыйная калегія: Заір АЗГУР Аляксандр БУТАКОЎ, Кастусь ГУБАРЭВІЧ, Васіль ІВАШЫН, Аркадзь МАРЦІНОВІЧ (адказны сакратар), Пятро ПРЫХОДЗЬКА, Раман САБАЛЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), Янка ШАРАХОЎСКІ, Іван ШАЦІЛА, Рыгор ШЫРМА.

[illegible]ура і мастацтва» выходзіць [illegible]на тыдзень: у сераду і суботу. АДРАС РЕДАК[illegible] рэдакт[illegible] харава, 19. Тэлефоны: прыёмнай рэдакцыі — 3-24-61, намесніка галоўнага літаратуры — 3-22-04, аддзела мастацтва — 3-24-62, аддзела культуры — 3-21-53.

Сталіна